*С. М. Пацкевіч, А. С. Бойка* (УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»)

# ДА ПЫТАННЯ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца пытанні эстэтычнага выхавання малодшых школьнікаў сродкамі мастацтва, падкрэсліваецца вызначальная роля ў гэтым працэсе настаўніка пачатковых класаў. Робіцца выснова пра ўплыў музычных заняткаў на факультэце пачатковай адукацыі на эстэтычнае развіццё будучых настаўнікаў.

Праблема абнаўлення духоўна-маральнай культуры грамадства існавала на ўсіх этапах яго развіцця. Гэтым абумоўлена ўвага да праблем тэорыі і практыкі эстэтычнага выхавання як важнейшага сродку фарміравання ўсебакова развітой, духоўна багатай асобы.

Найважнейшай задачай эстэтычнага выхавання з'яўляецца фарміраванне эстэтычнай і мастацкай культуры асобы. У аснове эстэтычнага выхавання ляжаць прынцыпы прыгажосці і гармоніі, а найбольш поўным увасабленнем гэтых прынцыпаў з'яўляецца мастацкая дзейнасць і яе вынікі – мастацтва. Таму эстэтычнае выхаванне – гэта працэс, звязаны з фарміраваннем у падрастаючага пакалення здольнасці «ўспрымаць і ацэнь-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ваць гарманічнае і дасканалае ў жыцці і мастацтве і тварыцьпа законах прыгажосці» [1, с. 60].

Самым магутным сродкам эстэтычнага выхавання і развіцця дзіцяці з'яўляецца мастацтва, якое па сваёй прыродзе валодае вялікімі выхаваўчымі магчымасцямі і ні з чым непараўнальнай сілайуздзеяння на падрастаючага чалавека. Яно валодае ўнікальнай здольнасцю фарміраваць і рознабакова развіваць асобу, уплываць на духоўны свет чалавека ў цэлым.

Малодшы школьны ўзрост – асаблівы перыяд дзяцінства, якому ўласціва эмацыянальнасць, развітое вобразнае мысленне і творчае ўяўленне. Мастацтва з'яўляецца тым светам, у якім дзеці адчуваюць сябе натуральна і нязмушана. З дапамогай розных сродкаў мастацтва яны могуць дастаткова свабодна выказаць свае пачуцці і жаданні, даць выхад эмоцыям. Такім чынам, далучаючы малодшага школьніка да багатага вопыту чалавецтва, назапашанага ў мастацтве, можна выхаваць высокамаральнага, адукаванага, рознабакова развітога сучаснага чалавека.

Унікальнымі па сваёй адукацыйнай і выхаваўчай значнасці магчымасцямі ў эстэтычным выхаванні малодшых школьнікаў валодаюць прадметы мастацка-эстэтычнага цыкла. Урокі мастацтва з'яўляюцца асноўнай формай далучэння дзяцей да сусветных культурных каштоўнасцей. Менавіта ў пачатковай школе закладваюцца асновы адукаванасці, фарміруецца светапогляд, эстэтычныя густы і патрэбы, што спрыяе, у канчатковым выніку, усебаковаму развіццю асобы. Настаўнік далучае дзяцей да таго ці іншага віду мастацтва, фарміруе і развівае ў іх разуменне яго мовы, добры густ, а потым і валоданне навыкамі творчасці.

На пачатковым этапе эстэтычнага развіцця асобы малодшага школьніка вызначальная роля належыць настаўніку пачатковых класаў, таму важна, у якой меры ён сам падрыхтаваны да выканання задач эстэтычнага выхавання. Настаўнік пачатковых класаў – гэта носьбіт культуры, прафесіяналізм якога павінен вызначацца не толькі спецыяльнымі ведамі і ўменнямі, але і асновамі эстэтычнай культуры, сфарміраванымі ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі ў педагагічнай ВНУ

Эстэтычнае развіццё будучых настаўнікаў прадугледжвае фарміраванне эстэтычнай свядомасці асобы, патрэб, эмацыянальна-пачуццёвых, ацэначных эстэтычных адносін і іх рэалізацыі ў паводзінах, схільнасцях і дзейнасці. Вынікі такога развіцця, замацоўваючыся ў асабістых якасцях студэнтаў, узбагачаюць усе формы зносін, пазнання і іх практычнай дзейнасці. Настаўнік пачатковых класаў, выкладаючы ўсе прадметы, уключаючы ўрокі музыкі і выяўленчага мастацтва, валодае вялікімі магчымасцямі ў фарміраванні эстэтычнай культуры малодшых школьнікаў.

Эстэтычнае выхаванне не абмяжоўваецца рамкамі ўрокаў, розныя формы пазаўрочнай, факультатыўнай і пазашкольнай работы спрыяюць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

фарміраванню мастацкіх інтарэсаў і густаў, развіццю ўяўленняў, творчых здольнасцей малодшых школьнікаў.

Адзначаючы ролю любога віду мастацтва ў гарманічным развіцці асобы, трэба адзначыць, што менавіта музыка заўсёды займала і займае асаблівае месца ў эстэтычным выхаванні: яна з'яўляецца найбольш актыўным сродкам эстэтычнага ўздзеяння на эмацыйную сферу чалавека. Уплыў музычнага мастацтва на асобу будучага педагога спрыяе яе маральна-эстэтычнаму развіццю: творчаму працэсу фарміравання эстэтычных каштоўнасцей і сістэмы арыентацыі; развіццю музычна-мастацкага ўспрымання і інтарэсаў; гарманізацыі асобы ў цэлым.

Музычныя заняткі на факультэце пачатковай адукацыі пакліканы развіваць у студэнтаў эмацыйную ўспрымальнасць, спрыяць набыццю імі вопыту эстэтычных ацэнак, фарміраванню музычна-мастацкага густу. Акрамя таго, неабходна навучыць будучых настаўнікаў арыентавацца ў музычным асяроддзі, ацэньваючы музычны матэрыял з пункту гледжання яго адукацыйнай, развіваючай і выхаваўчай значнасці падчас вывучэння такіх дысцыплін, як «Методыка выкладання музыкі з практыкумам» і «Хор». Пры падборы рэпертуару для заняткаў па вышэйназваных дысцыплінах трэба кіравацца агульна-мастацкай і метадычнайкаштоўнасцю, адукацыйнай і выхаваўчай значнасцю музычнага матэрыялу, магчымасцю яго выкарыстання падчас педагагічнай практыкі ў пачатковай школе.

Немалаважнае значэнне ў пашырэнні «мастацкага» кругагляду студэнтаў мае таксама пазааўдыторная праца. Наведванне музеяў, канцэртаў, тэатраў, сустрэчы з прадстаўнікамі творчых прафесій, экскурсіі – усё гэта спрыяе павышэнню ўзроўню эстэтычнай культуры будучых педагогаў і арыентуеіх на пастаянную і сістэматычную самаадукацыю і самаўдасканаленне.

## Літаратура

1. Эстетическая культура и эстетическое воспитание / сост. Г. С. Лабковская. – М.: Наука и техника, 1983. – 304 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова